Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 10 (633) Пятніца, 25 сакавіка 1966 года. Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## Насустрач XXIII з'езду КПСС

## РАСТУЦЬ ШАРЭНГІ КАМУНІСТАЎ

Ужо не тыдні, а дні аддзяляюць нас ад таго моманту, калі ў Маскве пачне сваю работу XXIII з'езд КПСС.

Рух за дастойную сустрэчу з'езду роднай партыі яшчэ вышэй узнімае ролю і адказнасць камуністаў у жыцці і творчай працы савецкіх людзей. Узяць такую адказнасць на сябе—запаветная мара кожнага савецкага чалавека. І таму не дзіўна, што ў перадз'ездаўскія дні стаць у авангардзе барацьбы за камунізм жадае ўсё больш і больш студэнтаў, аспірантаў і выкладчыкаў нашага універсітэта. У сваіх заявах аб прыёме ў члены КПСС яны пішуць, што жадаюць стаць актыўнымі будаўнікамі камуністычнага грамадства, што будуць нястомна працаваць на карысць нашай Радзімы.

Вось іх імёны: дацэнт хімфака Вячаслаў Мардыкін, студэнт філфака Аляксандр Сафроненка, дацэнт геафака Ольга Якушка і студэнт геафака Уладзімір Сідарэнка, аспірантка гістфака Ева Саўчук і кандыдат навук Яўген Камароўскі. Гэты спіс можна было б прадоўжыць, тым больш, што заявы аб уступленні ў кандыдаты і члены КПСС прадаўжаюць паступаць.

Партыйны камітэт універсітэта ўжо разгледзеў многія заявы і прыняў рашэнне аб прыёме ў партыю. Сярод прынятых і вышэй пералічаныя таварышы. Нам застаецца толькі сказаць:

— У добры шлях вам, маладыя камуністы!

Ул. БЛАКІТНЫ.

## У ПАРТКОМЕ

**На чарговым пасяджэнні парткома разглядалася пытанне аб правядзенні агляду мастацкай самадзейнасці нашага універсітэта, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. Партыйны камітэт адзначыў, што калектывы ўжо вядуць падрыхтоўку да яго. Усім ім аказана неабходная матэрыяльная дапамога ад рэктарата.**

**Партком адзначыў таксама, што цяперашні ўзровень работы Народнай харавой капэлы універсітэта (кіраўнік т. Білібін) не адпавядае высокім запатрабаванням. Галоўная прычына гэтага заключаецца ў нізкай арганізацыйнай дысцыпліне. Капэла не папоўнілася мужчынскімі галасамі, у яе не ўвайшлі лепшыя сілы факультэцкіх харавых калектываў.**

**Партыйная арганізацыя філалагічнага (сакратар т. Пауленка) і юрыдычнага факультэтаў (сакратар т. Матвіенка) не выканалі рашэння парткома ад 8 снежня 1965 года, якое было накіравана на палепшанне работы харавой капэлы. Мала ўвагі харавой капэле ўдзеляў таксама камітэт камсамола.**

**Партыйны камітэт прыняў наступную пастанову:**

**Абавязаць партыйныя бюро факультэтаў і камітэт камсамола аказваць сістэматычную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці ў іх падрыхтоўцы да агляду, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.**

**На чарговым пасяджэнні парткома заслухаць сакратароў партбюро філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў аб выкананні рашэння парткома ад 8 снежня 1965 года.**

**Прапанаваць партыйным бюро правесці агляд факультэцкай самадзейнасці з 2 па 7 красавіка 1966 года:**

**2) IV: фізфак—18.30—20;**
**хімфак—20.00—21.30;**
**3) IV; філфак—18.30—20;**
**геафак—20.00—21.30;**
**4) IV: матфак—18.30—20;**
**біяфак—20.00—21.30;**
**6) IV: гістфак—18.30—20;**
**юрфак—20.00—21.30.**

**16 красавіка даць заключны канцэрт для гарадскога журы.**

**Для агляду факультэцкай самадзейнасці універсітэта зацвердзіць журы:**

**А. Я. МАЛЫШАЎ—старшыня;**
**А. М. ВОЗЕРАЎ—Заслужаны артыст рэспублікі;**
**А. І. БІЛІБІН—Заслужаны артыст рэспублікі;**
**К. І. ШМЕЛЬКІН—Народны артыст рэспублікі;**
**М. А. ЛІСІЦЫН—кіраўнік аркестра універсітэта;**
**Л. К. АЛЯКСЮТОВІЧ—кіраўнік танцавальнага калектыву;**
**А. А. ВОЛК—намеснік сакратара парткома універсітэта;**
**С. А. ЛЫСЕНКА—член парткома;**
**Г. Я. РЫЛЮК—сакратар камітэта камсамола універсітэта;**
**В. З. РАБУШКА—старшыня прафкома;**
**А. ЗБРЫЦКІ—загадчык клуба.**



У кабінеце замежнай мовы. Фота А. КАДЗЕТА.

## СТАРТ ДАДЗЕН—

Студэнты нашага універсітэта, закончыўшы вну, будуць настаўнікамі, хімікамі, інжынерамі. Вытворчасць чакае нас высокакваліфікаванымі, здольнымі спецыялістамі, нас чакае калектыў, які даверыцца нам і будзе раўняцца на нас. Гэта многаму абавязвае. Бачыць сення кожнага нашага студэнта актывістам — гэта значыць, бачыць у ім заўтра, добрага арганізатара, кіраўніка, чалавека з тонкім палітычным пачуццём, улюбёнага ў сваю справу. Але такія якасці можа выхаваць у сабе толькі камсамолец, які з першых жа дзён уступлення яго ў арганізацыю актыўна ўключыцца ў жыццё камсамоліі. І калі яшчэ сёння існуюць такія тэрміны, як «актыў» і «пасіў», то, значыць, у нас яшчэ ёсць некаторыя промахі ў нашай рабоце.

Бывае, што на курсе, у групах на факультэце існуе «пасіў» толькі таму, што ўсю работу ў сваіх руках трымаюць актывісты — «штатныя» камсамольцы. Такія камсамольцы бегаюць, стараюцца, а воз і сёння там. Яны нават і не заўважаюць, як нагружаючыся абавязкамі за шасцярых-дзесяцярых, падрываюць агульную моц арганізацыі, робяць яе менш актыўнай. Радавыя камсамольцы бачаць, як бегаюць, мітусяцца іх важакі, але часам не ведаюць, дзеля чаго гэта. Што рашыла бюро? Ім не вядома. Іх не зацікавілі, не ўвялі ў курс справы, а, значыць, і пакінулі ў баку ад усіх спраў. Важакі павінны толькі каардынаваць дзеянні, накіроўваць на правільны шлях, кірунак.

Хочацца верыць, што «пасіва» з кожным днём будзе ўсё менш і менш, як гэта, скажам, ужо адчуваецца на многіх факультэтах нашага універсітэта. Бо з кожным днём пасля таго, як была прынята «Ленінская эстафета», бачыш, як расце армія актывістаў. І мы зробім усё, каб кожны выпускнік універсітэта быў не толькі высокакваліфікаваным спецыялістам, а і арганізатарам, прапагандыстам, актыўным будаўніком нашага грамадства.

С. СВОРАБ.

## КАМСАМОЛЬЦЫ НАПЕРАДЗЕ

Ленінская эстафета ахоплівае ўсё больш і больш груп, курсаў, факультэтаў універсітэта. Дэвіз камсамоліі—праверыць свае справы, жыццё—па Ільічу.

Але што зрабіць, каб пазнаць погляды, імкненні кожнага студэнга? Што зрабіць для таго, каб назаўсёды выкараніць «пасіўнасць» з нашых шарэнгаў? Адказаць на гэтае пытанне дапамагае пісьмовая анкета, якая напісана і распаўсюджана цяпер сярод камсамольцаў біялагічнага факультэта. У ёй шмат надзённых і неадкладных пытанняў камсамольскага жыцця. Запаўняючы такую анкету, камсамолец нібы сам з сабой раіцца, дае справаздачу, думае, што адказаць на тое, або іншае пытанне. Пасля таго, як усе анкеты будуць сабраны, адбудзецца агульны камсамольскі сход.

Ленінская эстафета ахоплівае ўсе бакі камсамольскага жыцця. Студэнт першага курса Сурыкаў напісаў сцэнарый, па якому мастацкая самадзейнасць факультэта рыхтуецца да агляду. Днямі біёлагі выйдуць і на свой першы веснавы нядзельнік.

Не застаюцца ў баку ад эстафеты аспіранты і выкладчыкі. Вопытныя камсамольцы—«стажнікі» таксама ўкладваюць шмат спраў у гэты важны пачын. На біяфаку лічаць, што эстафета—гэта самае масавае спаборніцтва, толькі з той асаблівасцю, што тут не будзе ні пераможцаў, ні пераможаных, бо перамагчы павінны ўсе разам.

А. КАЛАНТАЙ.

## ЯКІМ ПАВІНЕН БЫЦЬ НАСТАЎНІК ГЕАГРАФІІ?

Можна сказаць, што дыспут на геаграфічным факультэце, які праходзіць пад дэвізам: «Якім павінен быць настаўнік геаграфіі?, прымусіў задумацца і першакурсніка, які толькі што выбірае свой жыццёвы шлях, і пяцікурсніка, які хутка атрымае пуцёўку ў жыццё.

У госці да студэнтаў прыйшлі дырэктар школы рабочай моладзі № 33 М. Ю. Мельцар, загадчык навучальнай часткі школы № 32 К. А. Урсусава. Студэнтаў цікавіла, якія праблемы хвалююць настаўнікаў, а госці хацелі шчыра пагутарыць з тым, хто заўтра прыйдзе ім на дапамогу.

— Я ўжо трыццаць год працую настаўнікам геаграфіі, і калі б мне зноў выпала магчымасць выбіраць прафесію на жыццёвым шляху, я без вагання пачаў бы яго зноўку географам. Што можа быць цікавей, чым расказваць дзецям аб прыгажосці нашай роднай краіны або падарожнічаць па ёй з вучнямі?—гаворыць М. Ю. Мельцар. — Таму першае і асноўнае, да чаго павінен імкнуцца настаўнік — гэта прага ведаў. Толькі той настаўнік карыстаецца павагай у вучняў, хто многа ведае, хто не замыкаецца ў сабе, а шчодра аддае сваё багацце ведаў дзецям і людзям. Без настаўніка не было б ні вучонага, ні касманаўта, ні геолага.

Трафім Спірыдонавіч Рамашка прыпамінае: «Неяк я адпачываў у Крыму. На пляжы група маладых людзей (пазней высвятліў, што гэта былі медыкі) аб чымсьці гучна спрачалася. Яны не маглі прыйсці да згоды, хто іх экскурсавод. Метэаролаг? Ці хто іншы? А іх суправаджаў студэнт-географ, які цікава расказваў і пра мора, і пра горы, і пра гідрастанцыі, пра ўсё, што цікавіла дапытлівых турыстаў».

Пра сваю вучобу, пра надзённыя клопаты і хваляванні гаварылі студэнты. На геафаку выхоўваецца выдатнае папаўненне для школ. Аб гэтым сведчаць і вынікі прайшоўшай педагагічнай практыкі. Добрыя тэарэтычныя веды паказалі на ёй студэнты Лішык, Бацян, Кеда і іншыя. Студэнтка IV курса Еўдакімава падкрэслівае, што калі тэарэтычны багаж студэнта сапраўды багаты, дык метадычна, ён падрыхтаваны горш. Аб тым, як неабходны веды ў школе, гаварыла студэнтка другога курса Купцова, якая да паступлення ва універсітэт працавала ў школе. Адказваючы на закранутыя пытанні, дацэнт Умрэйка паведаміў, што на геаграфічным факультэце мяркуюць стварыць метадычны навуковы кабінет. Тут студэнты заўсёды змогуць замацаваць свае метадычныя навыкі.

Дэканат геаграфічнага факультэта, партыйнае і камсамольскае бюро зрабілі добрую справу, арганізаваўшы цікавы і карысны дыспут.

П. РОГАЧ.

## МЫ ЗАГАРТАВАНЫ Ў БАРАЦЬБЕ

*(Да 35-годдзя Саюза камуністычнай моладзі В'етнама)*

*Саюз камуністычнай моладзі В'етнама ўтварыўся ў 1930—1932 гадах, у перыяд пад'ёму рэвалюцыі.*

*Пад кіраўніцтвам партыі і нашага прэзідэнта Хо Шы Міна маладзёжны саюз заўсёды апраўдваў і апраўдвае званне аднаго з ударных атрадаў нашай партыі.*

*Мы па праву ганарымся тымі дарогамі славы і перамог, якія прайшоў наш маладзёжны саюз. Шмат верных сыноў нашага народа аддалі сваё жыццё за вызваленне і пабудову сацыялізма ў В'етнаме. Лі Ты Іон — першы юнак-камуніст, які загінуў у самы разгар нашай рэвалюцыі; Вотхі Соу — пятнаццацігадовая дзяўчына, мужная патрыётка, яна нават перад расстрэлам пела рэвалюцыйную песню.*

*Пасля ўстанаўлення міру наша краіна падзелена на дзве часткі. У Паўночным В'етнаме моладзь стала магутнай сілай у справе пабудовы сацыялізма і апраўдвае сваю ролю — рэзерва і актыўнага памочніка нашай партыі.*

*У Паўднёвым В'етнаме моладзь разам з усім народам вось ужо дваццаць год змагаецца супраць самага цынічнага ворага — амерыканскага імперыялізму.*

*Мы, моладзь, добра ведаем, што такое мір і шчасце. Мы клянёмся, што будзем заўсёды змагацца за мір, дэмакратыю і сацыялізм. Наша моладзь не адзінокая ў сваей барацьбе. Мы паўсядзённа адчуваем моцную сяброўскую падтрымку ад моладзі ўсяго свету, і перш за ўсё Савецкага Саюза. Шмат юнакоў і дзяўчат ЗША таксама падтрымліваюць нашу барацьбу.*

*Моладзь В'етнама ніколі, ніколі не стане на калені перад ворагам. В'етнам будзе аб'яднаны, наш гераічны народ будзе свабодным! Дзеля гэтага мы не пашкадуем свайго жыцця, лепш смерць, чым жыццё ў няволі.*

*Ведайце, амерыканскія агрэсары, нас не запалохаеце напалмам і ракетамі, мы пераможам!*

Нгуен Куанг Мінь,
в'етнамскі студэнт.

# СЛОВА—«СЛОВУ ФІЛОЛАГА»

## НА СТУДЭНЦКАЙ ХВАЛІ

Увага! Увага! Гаворыць радыёстанцыя «Студэнцкая хваля». Такія словы даволі часта можна пачуць у інтэрнаце па вуліцы Паркавая магістраль. Юнакі і дзяўчаты адкладваюць убок падручнікі і канспекты, уважліва слухаюць...

Цяпер ёсць ужо што і ўспомніць з перадач.

Перад святкаваннем 48-ай гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі перад студэнтамі выступіў прарэктар па навучальнай частцы нашага універсітэта А. Я. Малышаў, які расказаў шмат цікавага аб слаўных справах савецкага народа за сорак восем год. Спецыяльная перадача прысвечана была Рамэну Ралану. Аб яго жыцці і творчасці расказала дацэнт кафедры замежнай літаратуры Л. Я. Цімашкова. Традыцыйнымі сталі перадачы «Апошні званок», прысвечаныя пяцікурснікам. Малодшыя таварышы віншуюць іх з паспяховым заканчэннем універсітэта, жадаюць плённай працы на карысць нашай Радзіме.

Ва ўсіх перадачах вялікае месца адводзіцца паэзіі. З вершамі выступілі паэты-узлётаўцы — Мар'ян Дукса, Уладзімір Дзюба, Мікола Губернатараў.

Багатая музычная праграма. Усе запомнілі песні Яўгена Казюкіна ў выкананні Валерыя Ізотава.

Перадачы падабаюцца студэнтам інтэрната, відаць, яшчэ і таму, што падрыхтоўваюць іх сапраўдныя аматары сваёй справы начале са студэнтам IV курса аддзялення журналістыкі Аляксандрам Фларызякам. Ён — старшыня радыёкамітэта. На яго плячах усе арганізацыйныя клопаты. Грамадскае даручэнне камуніст Фларызяк выконвае добрасумленна. Вось ужо некалькі год у студэнцкім радыёкамітэце і Тамара Скудная, і дыктары і карэспандэнты Іван Макаловіч, Пятро Кузьміцкі, Леанід Дайнека і Уладзімір Хацяшоў.

У разгары новы навучальны семестр. У студэнцкім радыёкамітэце шмат спраў. У бліжэйшыя дні прагучаць новыя перадачы — «Смешнае вакол нас», «Студэнцкае жыццё вачыма юрыста» і іншыя.

Ды справы ішлі б яшчэ лепш, калі б прафком універсітэта пацікавіўся студэнцкім радыёкамітэтам, падтрымаў матэрыяльна. Не сакрэт, што Фларызяку прыходзілася ўжо абіваць парогі Беларускага радыё і тэлебачання, каб дастаць кавалак магнітафоннай плёнкі, бо грошай, каб яе купіць, у прафкоме не знайшлося. А мне здаецца, што «Студэнцкую хвалю», перадачы якой добра пастаўлены толькі ў нашым інтэрнаце, трэба падтрымліваць і арганізацыйна і матэрыяльна.

М. АЛЕНЧЫК.

## ФІЛОЛАГАМ ПАТРЭБНА БІБЛІЯТЭКА?

Тэма якую я хачу закрануць—важная і неадкладная: філолагам патрэбна свая бібліятэка, асабліва для студэнтаў вячэрняга аддзялення.

Стварылася такое становішча, што мы, вячэрнікі, практычна не можам карыстацца некаторымі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. У кнігарнях іх чамусьці няма, а нешматлікія экзэмпляры бібліятэкі галоўнага корпуса—на руках. Літаратура, якая знаходзіцца ў вучэбных кабінетах філалагічнага корпуса, дамоў не выдаецца. «Прыходзьце, чытайце»,— гавораць нам. А калі прыходзіць, калі чытаць? Днём мы працуем, вечарам—заняткі.

Студэнты дзённых аддзяленняў могуць займацца у чытальні галоўнага корпуса, у іх ёсць час пасядзець і ў кабінеце. У большасці ж вячэрнікаў вольны час толькі ў нядзелю. Таму для нас і патрэбна свая асобная бібліятэка... Тады б мы мелі магчымасць атрымаць на групу некалькі кніг і размеркаваць іх так, каб кожны прачытаў тую або іншую першакрыніцу.

І, вядома, пры такой бібліятэцы патрэбен таксама адпаведны чытальны зал, у якім мы маглі б пасядзець у любы час.

**М. МІХАЛАП,**
**студэнт першага курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.**

Пятро СУШКО

## НОВЫЯ ЭПІГРАМЫ

### РЭЦЭНЗІЯ НА КНІГУ

Па-першае,
пісана вершамі,
па-другое,
выданне недарагое,
па-трэцяе,
добра пераплецена,
па-чацвёртае,
сон агортвае,
па-астатняе,
наівыдатная!..

### *Муха—жывапісец*

*Партрэты засядзела*
*Са тры ў жыцці,*
*А ганарыцца ўдзелам*
*У развіцці...*

### На аднаго знаёмага

Яму, бясспрэчна,
прэмію далі б,
А мо і дзве...
А мо і тры,
калі б
Усё-усё,
што ён ні абнародуе,
Змяшчалася пад рубрыкай:
«Пародыі».

## ЦІ БУДЗЕ ІГРАЦЬ АРКЕСТР?

Мне часта прыпамінаецца гутарка дэкана нашага факультэта Р. В. Булацкага з абітурыентамі на ўступных экзаменах. Аб якіх толькі сваіх талентах не распіналіся яны тады?!

— Ну, — радаваўся дэкан, — цяпер на факультэце і актывістаў прыбудзе, і хор запяе, і аркестр грымне, і карагоды танцораў не згоніш са сцэны!..

І вось паступілі .Шмат хто, праўда, запісаўся ў розныя гурткі. Абяцанкі прадаўжаліся. Білі кулакамі сябе ў грудзі, кляліся наведваць кожную рэпетыцыю, старанна рыхтавацца да кожнага чарговага выступлення. Нехта з «музыкаў» сказаў нават неяк: «Што нам універсітэцкая самадзейнасць, сваю арганізуем, факультэцкую!» Камітэт камсамола ў сваю чаргу прапанаваў стварыць факультэцкі эстрадны канцэрт. Гэтую думку падтрымалі і выкладчыкі.

Многа клопатаў патраціў камітэт камсамола, каб на факультэце паявіліся музычныя інструменты. Здавалася, будуць яны, будуць вечары, канцэрты, танцы. Цяпер ёсць: і кларнет, і кантрабас, і труба, і барабан, і..., і ўсё маўчыць. Нядошлыя эстраднікі заскардзіліся, што ва універсітэце пальцы ў іх развучыліся іграць. Нядошлыя спевакі клянуцца, што вось ужо больш, як паўгода яны не могуць вылечыцца ад хрыпаты, а яшчэ іншыя ізноў, як і раней, клянуцца, але ўжо у тым, што ніколі ў жыцці ім не даводзілася быць ні спевакамі, ні музыкамі!

Сярод нямногіх, што не падвялі дэкана, студэнты першага курса аддзялення журналістыкі Л. Здановіч і Б. Герстэна. Пад іх кіраўніцтвам сапраўды пайшлі на добры лад справы студэнцкага тэатра мініятур. Яны паспелі ўжо выступіць некалькі разоў не толькі ва універсітэце, але і ў будаўнічым трэсце. Хочацца, каб гэты тэатр мініятур ударыў сваёй сатырай і гумарам па ўсіх клятвапарушальніках, бо хіба ж толькі так магу назваць гэтых нядошлых абяцаннікаў, псеўдамузыкантаў, а калі не псеўдамузыкантаў, то гультаёў і падманшчыкаў. Як бы там ні было, таварышы, ды аркестр павінен іграць: і кларнет, і кантрабас, і труба, і барабан!..

М. САЛАВЕЙ.



Спартсмены філфака на трэніроўцы. Фота А. КАДЗЕТА.

# НОВЫЯ КНІГІ

## ВЫКЛАДЧЫКА, СТУДЭНТ!

### СЛЯДАМІ ЛЕГЕНДЫ

Здавён кажуць, што Беларусь—зямля на паэтаў урадлівая. Сапраўды, шмат у нас «добрых і розных» паэтаў, мастацкіх летапісцаў часу. Шмат было і шмат будзе. А ці ўсё мы ведаем пра тыя мясціны, што іх узгадавалі, дзе яны развінулі крылы? Далёка не ўсё. І найлепшае пацвярджэнне гэтаму — кніга дацэнта Сцяпана Александровіча «Па слядах паэтычнай легенды».

У ёй—удумлівы даследчык літаратуры, актыўны адкрывальнік яе забытых старонак, цікава расказвае пра рэвалюцыйны шлях Кастуся Каліноўскага, пра дарогі маленства Кузьмы Чорнага, пра мясціны, звязаныя з імёнамі Максіма Танка, Міхася Лынькова, Пятруся Броўкі.

У кнігу ўключаны артыкулы пра Францішка Скарыну і Францішка Багушэвіча, напісаныя жыва і з глыбокім веданнем матэрыялаў. Выкарыстаныя даследчыкам новыя архіўныя і друкаваныя крыніцы надаюць ім асаблівую важкасць.

В. КАЧАНОВІЧ.

### *ДУБОЎКА ТАКІ, ЯК ЁСЦЬ*

Крытыкі яўна адсталі: да гэтага часу не было ніводнай манаграфіі, нават маленькай брашуры пра творчасць Уладзіміра Дубоўкі— аднаго з пачынальнікаў беларускай савецкай паэзіі. Я кажу «не было», бо гэта прабел у вялікай ступені цяпер запоўніў крытыка-бібліяграфічны нарыс пра паэта.

Яго аўтар—дацэнт кафедры беларускай літаратуры Дзмітрый Бугаёў. Даследчык упершыню з такой скрупулёзнасцю паказвае ўвесь творчы набытак паэта, яго месца ў скарбніцы беларускай духоўнай культуры.

Адной з адметнасцей кнігі Д. Бугаёва з'яўляецца тое, што даследчык удала прасочвае ў непарыўнай еднасці жыццёвы і творчы шлях паэта, паказвае яго, як грамадзяніна і як мастака слова адначасова.

Доўгі час хадзіла легенда пра быццам бы непрыязнасць Ул. Дубоўкі да Якуба Коласа. Дакументальна, а таксама аналізам пэўных твораў Дубоўкі, дзе плённа выкарыстоўваліся традыцыі класіка беларускай літаратуры, дакладчык паказаў поўную беспадстаўнасць падобных легендаў. Адно тое, што Якуб Колас пасля вайны сам хадайнічаў перад Урадам аб рэабілітацыі паэта, гаворыць пра многае.

Дубоўка паўстае з кнігі Дзмітрыя Бугаёва такім, якім ён ёсць на самой справе: вялікім жыццялюбам, мудрым майстрам паэтычнага слова, сапраўдным патрыётам савецкай бацькаўшчыны.

В. РАГОЙША.

### ПЕРШЫЯ КРОКІ БЕЛАРУСКАЙ СТЫЛІСТЫКІ

*У канцы мінулага года ў Маскве адбыўся VI пленум праўлення Саюза журналістаў, дзе вялася размова пра журналісцкае майстэрства. Патрэба ў ёй адчувалася даўно, таму што ў нас шмат гаварылася, аб чым пісаць, але зусім мала аб тым, як пісаць? Праблема ж майстэрства, моўнай культуры цесна звязана са стылістыкай, якая вучыць, як трэба будаваць сказы і ўвогуле, як пісаць.*

*У 1962 годзе выйшла «Практычная стылістыка беларускай мовы» М. Я. Цікоцкага. У прадмове аўтар пісаў. «Вельмі важна правільна выкарыстоўваць багатыя сродкі роднай мовы ў адпаведнасці з характарам выказвання, з жанрам, стылёвай накіраванасцю літаратурнага твора». Важнасць гэтай думкі аўтар пацвердзіў усёй кнігай, абапіраючыся на творчасць класікаў беларускай літаратуры Я. Коласа, Я. Купалу, сучасных пісьменнікаў, а таксама на матэрыялы часопісаў і газет.*

*Таму не выпадкова выдавецтва «Народная асвета» ў 1965 годзе выдала 11 частку «Практычнай стылістыкі беларускай мовы» таго ж аўтара. Гэта зноў жа дыктавалася важнасцю і перспектыўнасцю прадмета. Зноў, як і ў першай частцы, тут тэарэтычныя перадумовы марфалагічнай і сінтаксічнай стылістыкі суправаджаюцца прыкладамі з беларускай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі. У кніжцы ёсць шмат практыкаванняў для практычнага курсу стылістыкі філалагічных факультэтаў.*

*Размова аб стылістыцы — гэта размова аб культуры нашай мовы наогул. Гэтым абумоўлен вельмі шырокі попыт на кнігу.*

*Даследаванне загадчыка кафедры тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку аддзялення журналістыкі дацэнта М. Я. Цікоцкага — першая, як кажуць, ластаўка. Але гэта тая ластаўка, якая сапраўды «робіць вясну», бо работа абагульняе зробленае яе аўтарам дзеля развіцця навукі аб стылі ў нашай рэспубліцы ўвогуле.*

*К. СТРЭПЕТАВА,*

Рэдактар А. ЛОЙКА.

АТ 00828 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 440.